Установа адукацыі

«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар БДТУ па вучэбнай рабоце
____________ А.А. Саковіч
«_____»_________________2023 года
Рэгістрацыйны № УД ______ / вуч.

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**

**6-05-0211-06 Выдавецкая справа**

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0211-06-2023 і вучэбных планаў рэгістрацыйныя №№ 05-021-001/уч. (зацв. 28.04.2023) і 05-021-002/уч. (зацв. 28.04.2023).

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**В. У. Русак**, загадчык кафедры беларускай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**В. А. Мандзік**, старшы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», кандыдат філалагічных навук.

**У. І. Кулікові̇ч**, загадчык кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай беларускай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» (пратакол № 11 ад 22.06.2023);

метадычнай камісіяй факультэта прынттэхналогій і медыякамунікацый (пратакол №10 ад 30.06.2023);

навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» (пратакол №8 ад 30.06.2023).

## 1. Тлумачальная запіска

### Месца вучэбнай дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй

Выкарыстанне беларускай мовы як дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь ставіць высокія патрабаванні да маўленчай культуры будучых спецыялістаў выдавецкай справы, якія ў сваёй прафесійнай дзейнасці павінны забяспечваць і падтрымліваць статус роднай мовы. Вывучэнне курса сучаснай беларускай мовы будучымі рэдактарамі-тэхнолагамі з’яўляецца неад’емным элементам фарміравання прафесійнай кампетэнцыі і асновай для набыцця маўленчага вопыту ў розных сферах зносін.

Выкладанне дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» забяспечвае паглыбленае авалоданне беларускай мовай, развівае пачуццё нацыянальнай самасвядомасці на аснове павагі да беларускай мовы як нацыянальнага скарбу. У студэнтаў фарміруюцца веды пра беларускую мову як нацыянальную з развітай сістэмай літаратурных нормаў. Курс сучаснай беларускай мовы прадугледжвае засваенне і паглыбленне ведаў студэнтаў па такіх раздзелах мовазнаўства, як лексікалогія, лексікаграфія, фанетыка, арфаэпія, арфаграфія, марфалогія, сінтаксіс. Асаблівая ўвага надаецца ўзбагачэнню слоўнікавага запасу і развіццю арфаграфічных навыкаў, раскрыццю шляхоў і спосабаў узбагачэння прафесійна-тэрміналагічнай лексікі.

### Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны

**Мэтай** вывучэння курса «Сучасная беларуская мова» з’яўляецца прафесійна арыентаванае ўдасканаленне ўменняў і навыкаў валодання лексічнай базай беларускай літаратурнай мовы, фарміраванне высокай культуры маўлення, засваенне тэарэтычнай базы, неабходнай для самастойнай вытворчасці рознажанравых тэкстаў.

Змест дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» прадугледжвае вырашэнне наступных **задач**:

– асэнсаванне студэнтамі ролі мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі і культурнай ідэнтыфікацыі асобы;

– фарміраванне ў студэнтаў трывалых ведаў па лінгвістычнай тэорыі і выпрацоўка на яе аснове аналітычных і канструктыўных уменняў, звязаных з распазнаваннем, класіфікацыяй і навуковай інтэрпрэтацыяй разнастайных моўных адзінак;

– развіццё здольнасцей студэнтаў, неабходных для ўспрыняцця, разумення, трансфармацыі, стварэння тэкстаў, разнастайных па жанравай і стылістычнай накіраванасці;

– стымуляванне актыўнай камунікатыўнай дзейнасці студэнтаў як умовы паспяховай ідэнтыфікацыі, акультурацыі і самарэалізацыі індывіда ў грамадстве;

– выхаванне сродкамі мовы каштоўнасных арыентацый, нормаў і правіл фарміравання паводзін на аснове дзяржаўнай ідэалогіі, ідэй гуманізму, дабра і справядлівасці.

Засваенне студэнтамі дысцыпліны «Сучасная беларуская мова» забяспечвае фарміраванне такой універсальнай кампетэнцыі, як здольнасць выкарыстоўваць паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці (УК-10).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі асобы;

– месца беларускай мовы сярод іншых моў свету;

– асноўныя этапы гісторыі развіцця беларускай мовы;

– сістэму лексічных, граматычных, стылістычных сродкаў беларускай мовы і іх камунікатыўныя магчымасці;

– асноўныя лексікаграфічныя крыніцы па спецыяльнасці;

– асноўныя этапы станаўлення беларускай лінгвістыкі;

***умець:***

– прымяняць асноўныя арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя і пунктуацыйныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, ведаць спосабы і сродкі выражэння граматычных катэгорый і значэнняў;

– аналізаваць і характарызаваць гістарычнае міжмоўнае ўзаемадзеянне ў прычынна-выніковым аспекце;

– аналізаваць і характарызаваць тэксты розных стыляў, жанраў, тыпаў маўлення з пункту гледжання іх зместу, структуры і мэтанакіраванасці;

***валодаць:***

– сістэмай норм беларускай мовы і асаблівасцямі іх ужывання ў розных сферах;

– навыкамі дзелавой і прафесійнай вуснай і пісьмовай камунікацыі.

**Сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.** Веды, набытыя пры вывучэнні курса сучаснай беларускай мовы, неабходныя для паспяховага засваення такіх вучэбных дысцыплін, як “Практычная і функцыянальная стылістыка беларускай мовы”, “Агульны курс рэдагавання”, “Рэдагаванне даведачнай літаратуры”, “Рэдагаванне перакладной літаратуры”, “Рэдактарская падрыхтоўка навукова-тэхнічных і вучэбных выданняў”, “Рэдактарская падрыхтоўка выданняў для дзяцей”, “Рэдактарская падрыхтоўка літаратурна-мастацкіх выданняў”, “Рэдактарская падрыхтоўка СМІ”.

**План вучэбнай дысцыпліны для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі**

| Курс | Семестр | Усяго вучэбных гадзін | Колькасць заліковых адзінак | Аўдыторных гадзін (у адпаведнасці з вучэбным планам УВА) | | | Форма бягучай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | |
| I | I | 216 | 6 | 108 | 36 | 72 | экзамен |

**План вучэбнай дысцыпліны для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі**

| Курс | Семестр | Усяго вучэбных гадзін | Колькасць заліковых адзінак | Аўдыторных гадзін (у адпаведнасці з вучэбным планам УВА) | | | Форма бягучай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | |
| I | I | 216 | 6 | 20 | 8 | 12 | экзамен |

## 2. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. Уводзіны ў курс “Сучасная беларуская мова”

Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа, яе месца сярод іншых моў свету. Формы беларускай нацыянальнай мовы: літаратурная і дыялектная.

Сучасная беларуская літаратурная мова і яе разнавіднасці: вусная і пісьмовая.

Нормы літаратурнай мовы: арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя.

Мова і маўленне. Формы маўлення: маналог, дыялог, тэкст.

Умовы і этапы развіцця беларускай мовы. Роля сучаснай беларускай літаратурнай мовы па забеспячэнні ўсіх сфер грамадскага жыцця беларускага народа.

Вядомыя беларускія мовазнаўцы, іх навуковая спадчына. Уклад беларускіх пісьменнікаў і вучоных у развіццё беларускай мовы на сучасным этапе.

## 2. Фанетыка

Фанетыка як навука аб гукавым ладзе мовы. Прадмет і задачы фанетыкі. Фанетычная транскрыпцыя. Гукі беларускай мовы і іх узаемадзеянне ў моўнай плыні.

Галосныя гукі і іх класіфікацыя. Чаргаванне галосных гукаў. Прыстаўныя галосныя гукі. Зычныя гукі і іх класіфікацыя. Гук [ў]. Змены зычных. Асіміляцыя і дысіміляцыя зычных. Падаўжэнне і падваенне зычных. Дзеканне і цеканне. Чаргаванне зычных гукаў. Прыстаўныя зычныя гукі.

Склад. Складападзел. Прасадычныя сродкі мовы (націск, інтанацыя) і іх роля ў арганізацыі моўнай плыні.

## 3. Арфаэпія

Арфаэпія і яе задачы. З гісторыі беларускай арфаэпіі. Асноўныя нормы сучаснага беларускага літаратурнага вымаўлення.

Вымаўленне галосных гукаў. Вымаўленне зычных гукаў і іх спалучэнняў. Адхіленні ад нормаў літаратурнага вымаўлення і іх прычыны.

## 4. Графіка

Графіка, яе змест і задачы.

Пісьмо ў гісторыі развіцця чалавецтва. Віды пісьма.

Гук і літара, іх суадносіны. Графіка і алфавіт. Беларускі алфавіт. Іншыя графічныя сродкі беларускага пісьма: апостраф, злучок, абзац, знак націску, параграфа, знакі прыпынку і інш. Суадносіны паміж літарамі і гукамі. Асноўныя прынцыпы сучаснай беларускай графікі: гукавы і складовы.

Паходжанне і развіццё беларускай графікі. Кірыліца – аснова беларускай графікі. Іншыя графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства.

## 5. Арфаграфія

Арфаграфія, яе змест і задачы. Этапы развіцця беларускай арфаграфіі.

Роля беларускіх мовазнаўцаў ва ўдасканаленні беларускага правапісу. Тэндэнцыі развіцця арфаграфічнай нормы на сучасным этапе.

Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны і фанематычны (марфалагічны). Напісанні паводле фанетычнага і марфалагічнага прынцыпаў. Традыцыйны і дыферэнцыйны прынцыпы.

Напісанні слоў разам, асобна, праз злучок. Напісанне вялікай літары. Правілы пераносу слоў. Правілы графічнага скарачэння слоў.

## 6. Лексікалогія

Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Сувязь лексікалогіі з іншымі галінамі мовазнаўства.

Слова як асноўная адзінка мовы. Лексічнае і граматычнае значэнні слова.

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова. Віды пераносу значэнняў. Метафара, метанімія, сінекдаха, іх стылістычная, вобразна-выяўленчая і мастацкая роля ў мове.

Амонімы. Крыніцы ўзнікнення амонімаў, іх паходжанне і развіццё. Размежаванне амонімаў і мнагазначных слоў. Амалексемы, амафоны, амаформы і амографы. Стылістычнае выкарыстанне амонімаў.

Паронімы. Граматычная характарыстыка паронімаў. Семантычныя асаблівасці і функцыі паронімаў. Стылістычныя памылкі ва ўжыванні паронімаў.

Сінонімы. Паняцце сінанімічнага рада і дамінанты. Семантычныя асаблівасці сінонімаў, іх узнікненне і развіццё. Граматычныя тыпы сінонімаў. Семантычныя і стылістычныя сінонімы. Семантыка-стылістычныя сінонімы. Кантэкстуальныя сінонімы. Абсалютныя сінонімы (дублеты). Функцыянальнае ўжыванне сінонімаў, іх стылістычная роля і прызначэнне.

Антонімы. Лексіка-граматычныя і семантычныя асаблівасці антонімаў. Сродкі выражэння антаніміі. Агульныя і канцэптуальныя, поўныя і няпоўныя, агульнаўжывальныя і аўтарскія, індывідуальна-стылістычныя антонімы. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў.

Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання. Спрадвечная лексіка беларускай мовы. Агульнаславянская лексіка. Усходнеславянская лексіка. Уласнабеларуская лексіка. Нацыянальная адметнасць беларускай лексікі. Запазычаная лексіка ў беларускай мове, яе прыметы. Лексічныя запазычанні са славянскіх моў. Лексічныя запазычанні з неславянскіх моў. Інтэрнацыянальная лексіка. Экзатызмы і варварызмы. Калькі: поўныя і няпоўныя, словаўтваральныя і семантычныя.

Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Дыялектная лексіка і яе разнавіднасці. Спецыяльная лексіка: тэрміны і прафесіяналізмы. Паняцце тэрміна і тэрміналогіі. Тэрміналагічная лексіка паводле паходжання: спрадвечна беларуская і запазычаная. Тэрміны вузкаспецыяльныя, агульнанавуковыя, міжнавуковыя.

Жаргонная лексіка. Аргатызмы.

Актыўная і пасіўная лексіка. Гістарызмы. Архаізмы. Неалагізмы. Шляхі ўзнікнення неалагізмаў і іх разнавіднасці.

Нацыянальная адметнасць беларускай лексікі.

## 7. Фразеалогія

Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Прадмет вывучэння і задачы фразеалогіі. Паняцце фразеалагічнай адзінкі. Класіфікацыя фразеалагізмаў: фразеалагічныя зрашчэнні (ідыёмы), фразеалагічныя адзінствы, фразеалагічныя злучэнні.

Класіфікацыя фразеалагізмаў паводле паходжання. Спрадвечныя беларускія і запазычаныя фразеалагізмы.

Фразеалагічныя калькі ў беларускай мове.

Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў. Міжстылёвыя фразеалагізмы. Размоўна-гутарковыя і кніжныя фразеалагізмы.

Мнагазначнасць, сінанімічнасць, аманімічнасць і антанімічнасць фразеалагізмаў.

Прыказкі, прымаўкі, крылатыя выразы (афарызмы). Перыфразы. Перыфразы індывідуальна-аўтарскія і традыцыйныя.

### 8. Лексікаграфія

Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Прадмет і задачы лексікаграфіі.

Слоўнікі і іх тыпы. Энцыклапедычныя і лінгвістычныя слоўнікі. Агульныя энцыклапедычныя і галіновыя слоўнікі. Лінгвістычныя слоўнікі. Тыпы лінгвістычных слоўнікаў. Аднамоўныя і шматмоўныя (перакладныя) лінгвістычныя слоўнікі. Тыпы аднамоўных слоўнікаў: арфаграфічныя, тлумачальныя, дыялектныя, гістарычныя, этымалагічныя, тэрміналагічныя, фразеалагічныя, сінанімічныя, аманімічныя, паранімічныя, антанімічныя, анамастычныя, марфемныя, арфаэпічныя, частотныя і інш.

З гісторыі лексікаграфіі. Персаналіі беларускай лексікаграфіі. Лексікаграфічныя працы Ф. Скарыны, Л. Зізанія, П. Бярынды, І. Насовіча і інш. Лексікаграфічныя працы XX стагоддзя.

### 9. Марфемная будова слова. Словаўтварэнне

Паняцце марфемы. Марфемная структура слова. Слова і марфема. Тыпы марфем. Аснова слова і яе тыпы: невытворная і вытворная. Утваральная аснова. Суплетыўныя асновы. Канчатак нулявы і матэрыяльна выражаны.

Змены ў марфемнай будове слова: апрошчанне і перараскладанне.

Корань і афіксы. Корань слова. Свабодныя і звязаныя карані.

Афіксы і іх віды: прыстаўка, або прэфікс; суфікс; постфікс; інтэрфікс. Словаўтваральныя і формаўтваральныя афіксы. Сінанімічныя і антанімічныя афіксы.

Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў: марфемны (суфіксальны, прыставачны, постфіксальны, прыставачна-суфіксальны, прыставачна-постфіксальны); субстантывацыя; лексіка-семантычны спосаб; складанне; складана-суфіксальны; зрашчэнні і абрэвіяцыя.

### 10. Марфалогія

Марфалогія як раздзел граматыкі, яе змест і задачы. Сувязь марфалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Асноўныя паняцці марфалогіі: граматычнае значэнне, граматычная форма, граматычная катэгорыя. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове.

Назоўнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: уласныя, агульныя, адушаўлёныя (асабовыя і неасабовыя), неадушаўлёныя, канкрэтныя, абстрактныя, зборныя, рэчыўныя.

Граматычныя катэгорыі назоўніка: род, лік, склон. Род назоўнікаў. Разыходжанні ў граматычным родзе некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Лік назоўнікаў. Разыходжанні ў ліку назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Склон назоўнікаў. Значэнні склонаў. Тыпы скланення назоўнікаў. Першае скланенне назоўнікаў. Другое скланенне назоўнікаў. Трэцяе скланенне назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Рознаскланяльныя і нескланяльныя назоўнікі. Словаўтварэнне назоўнікаў.

Прыметнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады прыметніка: якасныя, адносныя і прыналежныя. Якасныя прыметнікі. Адносныя прыметнікі. Прыналежныя прыметнікі. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Формы суб'ектыўнай ацэнкі якасных прыметнікаў. Скланенне прыметнікаў. Словаўтварэнне прыметнікаў.

Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў. Колькасныя лічэбнікі. Іх скланенне і спалучальнасць з назоўнікамі. Зборныя лічэбнікі. Дробавыя лічэбнікі. Парадкавыя лічэбнікі. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі.

Займеннік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады займеннікаў: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя, неазначальныя (няпэўныя), іх характарыстыка. Скланенне займеннікаў. Пераход займеннікаў у іншыя часціны мовы.

Дзеяслоў як часціна мовы. Разрады дзеясловаў: інфінітыў, спрагальныя формы, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе. Спрагальныя і неспрагальныя формы дзеяслова. Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў). Асновы дзеяслова. Пераходныя і непераходныя дзеясловы. Зваротныя дзеясловы. Стан дзеяслова. Трыванне дзеяслова. Лад дзеяслова (абвесны, умоўны і загадны). Час дзеяслова (цяперашні, прошлы і будучы). Асоба дзеяслова. Безасабовыя дзеясловы. Спражэнне дзеясловаў. Словаўтварэнне дзеясловаў.

Дзеепрыметнік, яго значэнне і сінтаксічныя функцыі. Утварэнне дзеепрыметнікаў. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай мове.

Дзеепрыслоўе, яго значэнне і сінтаксічныя функцыі. Утварэнне дзеепрыслоўяў. Ужыванне дзеепрыслоўяў.

Прыслоўе як часціна мовы. Разрады прыслоўяў паводле значэння: азначальныя і акалічнасныя. Ступені параўнання якасных прыслоўяў. Спосабы ўтварэння прыслоўяў.

Безасабова-прэдыкатыўныя словы, іх лексічнае значэнне, марфалагічныя катэгорыі і сінтаксічная функцыя. Утварэнне безасабова-прэдыкатыўных слоў.

Мадальныя словы. Агульнае паняцце. Значэнні мадальных слоў, сфера іх выкарыстання.

Службовыя часціны мовы. Агульная характарыстыка службовых часцін мовы, іх класіфікацыя: прыназоўнік, злучнік, часціцы.

Прыназоўнік як часціна мовы. Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове.

Злучнік як часціна мовы. Разрады злучнікаў паводле паходжання, структуры і спосабу ўжывання. Разрады злучнікаў паводле сінтаксічнай функцыі.

Часціцы як часціна мовы. Разрады часціц паводле саставу, паходжання і значэння.

Выклічнік як часціна мовы. Разрады выклічнікаў. Гукапераймальныя словы, іх адрозненне ад выклічнікаў. Пераход іншых слоў і цэласных спалучэнняў у выклічнікі.

## 11. Сінтаксіс

Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго змест і задачы.

Словазлучэнне. Паняцце словазлучэння. Тыпы словазлучэнняў. Віды сувязі слоў у словазлучэннях. Асаблівасці будовы словазлучэнняў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (у параўнанні з рускай мовай).

Сказ. Тыпы сказаў. Сказ як асноўная сінтаксічная адзінка. Тыпы сказаў паводле мэты выказвання. Тыпы сказаў паводле адносін выказвання да рэчаіснасці. Тыпы сказаў паводле граматычнай структуры.

Просты сказ. Двухсастаўныя сказы. Галоўныя члены сказа. Дзейнік і яго выражэнне. Выказнік. Тыпы выказнікаў і іх выражэнне. Каардынацыя выказніка з дзейнікам.

Даданыя члены сказа. Дапаўненне. Прамыя і ўскосныя дапаўненні і іх выражэнне.

Азначэнне. Дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні. Прыдатак як разнавіднасць азначэння. Структурна-граматычныя і семантычныя тыпы прыдаткаў.

Акалічнасці. Разрады акалічнасцяў: акалічнасці месца, часу, прычыны, мэты, умовы, уступкі, спосабу дзеяння, акалічнасці меры і ступені.

Аднародныя члены сказа. Сувязь выказніка з аднароднымі дзейнікамі. Злучнікі пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Абагульняльныя словы ў сказах з аднароднымі членамі і знакі прыпынку пры іх.

Адасобленыя даданыя члены сказа. Паняцце адасаблення. Адасабленне дапасаваных і недапасаваных азначэнняў. Адасабленне прыдаткаў. Адасабленне акалічнасцей. Адасабленне дапаўненняў. Адасабленне далучальных членаў сказа.

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Спосабы выражэння параўнання. Адрозненне параўнальных зваротаў ад даданых параўнальных частак складаназалежнага сказа. Сінтаксічная роля параўнальных зваротаў.

Зваротак. Спосабы выражэння звароткa. Знакі прыпынку пры зваротках.

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы. Знакі прыпынку пры іх.

Устаўныя словы, словазлучэнні і сказы. Знакі прыпынку пры іх.

Аднасастаўныя сказы. Структура аднасастаўных сказаў. Тыпы аднасастаўных сказаў: пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя, інфінітыўныя, намінатыўныя сказы. Сінтаксічна непадзельныя сказы. Няпоўныя сказы.

Парадак слоў у сказе. Роля парадку слоў у сказе.

Складаны сказ. Паняцце складанага сказа. Класіфікацыя складаных сказаў.

Складаназлучаныя сказы. Агульнае паняцце складаназлучаных сказаў. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі часткамі. Складаназлучаныя сказы з супастаўляльнымі часткамі. Складаназлучаныя сказы з пералічальна-размеркавальнымі часткамі. Складаназлучаныя сказы з далучальнымі часткамі. Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах.

Складаназалежны сказ. Агульнае паняцце складаназалежных сказаў. Роля падпарадкавальных злучнікаў і злучальных слоў у складаназалежным сказе.

Тыпы даданых частак складаназалежных сказаў: дзейнікавыя, выказнікавыя, дапаўняльныя, азначальныя і акалічнасныя (месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступкі, выніку, спосабу дзеяння, меры і ступені). Складаназалежныя сказы з даданымі параўнальнымі часткамі. Складаназалежныя сказы з даданымі далучальнымі часткамі.

Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі, іх разнавіднасці. Складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным і неаднародным падпарадкаваннем даданых частак. Складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем даданых частак. Складаназалежныя сказы са змешаным падпарадкаваннем. Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах.

Бяззлучнікавы складаны сказ. Агульнае паняцце бяззлучнікавых складаных сказаў. Тыпы бяззлучнікавых складаных сказаў.Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, іх разнавіднасці. Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

Чужая мова і спосабы яе перадачы. Простая мова і знакі прыпынку пры ёй. Ускосная мова. Няўласна-простая мова. Цытаты і правілы іх афармлення. Адметнасць іх выкарыстання ў тэкстах.

## 12. Пунктуацыя

Пунктуацыя. Паняцце пунктуацыі. З гісторыі ўзнікнення і развіцця пунктуацыі. Класіфікацыя знакаў прыпынку. Раздзяляльныя і выдзяляльныя знакі прыпынку.

## 3. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЛЯ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № раздзела, тэмы | НАЗВА РАЗДЗЕЛА, ТЭМЫ | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін самастойнай працы | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1.** | **УВОДЗІНЫ Ў КУРС "СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА"** | **2** | **2** | **4** | Экзамен |
| | 1. Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа, яе месца сярод іншых моў свету. Формы беларускай нацыянальнай мовы: літаратурная і дыялектная.<br>2. Сучасная беларуская літаратурная мова і яе разнавіднасці: вусная і пісьмовая.<br>3. Нормы літаратурнай мовы: арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя.<br>4. Мова і маўленне. Формы маўлення: маналог, дыялог, тэкст.<br>5. Умовы і этапы развіцця беларускай мовы. Роля сучаснай беларускай літаратурнай мовы па забеспячэнні ўсіх сфер грамадскага жыцця беларускага народа.<br>6. Вядомыя беларускія мовазнаўцы, іх навуковая спадчына. Уклад беларускіх пісьменнікаў і вучоных у развіццё беларускай мовы на сучасным этапе. | 2 | 2 | 2<br>2 | Тэст<br>Вуснае апытанне |
| **2.** | **ФАНЕТЫКА** | **1** | **2** | **4** | Экзамен |
| | 1. Фанетыка як навука аб гукавым ладзе мовы. Прадмет і задачы фанетыкі. Фанетычная транскрыпцыя. Гукі беларускай мовы і іх узаемадзеянне ў моўнай плыні.<br>2. Галосныя гукі і іх класіфікацыя. Чаргаванне галосных гукаў. Прыстаўныя галосныя гукі.<br>3. Зычныя гукі і іх класіфікацыя. Гук [ў]. Змены зычных. Асіміляцыя і дысіміляцыя зычных. Падаўжэнне і падваенне зычных. Дзеканне і цеканне. Чаргаванне зычных гукаў. Прыстаўныя зычныя гукі.<br>4. Склад. Складападзел. Прасадычныя сродкі мовы (націск, інтанацыя) і іх роля ў арганізацыі моўнай плыні. | 1 | 2 | 2<br>2 | Тэст |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **3.** | **АРФАЭПІЯ** | **1** | **2** | **4** | Экзамен |
| | 1. Арфаэпія і яе задачы. З гісторыі беларускай арфаэпіі. Асноўныя нормы сучаснага беларускага літаратурнага вымаўлення.<br>2. Вымаўленне галосных гукаў.<br>3. Вымаўленне зычных гукаў і іх спалучэнняў. Адхіленні ад нормаў літаратурнага вымаўлення і іх прычыны. | 1 | 2 | 2<br><br>2 | Тэст<br><br>Вуснае апытанне |
| **4.** | **ГРАФІКА** | **1** | **2** | **4** | Экзамен |
| | 1. Графіка, яе змест і задачы. Пісьмо ў гісторыі развіцця. Суадносіны паміж літарамі і гукамі. Асноўныя прынцыпы сучаснай беларускай графікі: гукавы і складовы.<br>2. Паходжанне і развіццё беларускай графікі. Кірыліца – аснова беларускай графікі. Іншыя графічныя сістэмы ў гісторыі беларускага пісьменства. | 1 | 2 | 2<br><br>2 | Тэст |
| **5.** | **АРФАГРАФІЯ** | **2** | **6** | **14** | Экзамен |
| | 1. Арфаграфія, яе змест і задачы. Этапы развіцця беларускай арфаграфіі. Роля беларускіх мовазнаўцаў ва ўдасканаленні беларускага правапісу.<br>2. Асноўныя прынцыпы беларускай арфаграфіі: фанетычны і фанематычны (марфалагічны). Напісанні паводле фанетычнага і марфалагічнага прынцыпаў. Традыцыйны і дыферэнцыйны прынцыпы.<br>2.1 Правапіс галосных. Правапіс літар о, э, а.<br>2.2 Правапіс літар е, ё, я. Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах. Правапіс прыстаўных галосных. Правапіс літар і, ы, й пасля прыставак. Правапіс літар у-ў. Напісанне галосных е-і.<br>2.3 Правапіс зычных. Правапіс звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых. Правапіс зычных д-дз і т-ц. Правапіс падоўжаных зычных.<br>2.4 Правапіс некаторых спалучэнняў зычных. Правапіс мяккага знака і апострафа. Правапіс прыстаўных зычных.<br>3. Напісанні слоў разам, асобна, праз злучок.<br>4. Напісанне вялікай літары. Правілы пераносу слоў. Правілы графічнага скарачэння слоў. | 1<br><br><br><br><br><br><br><br><br>1 | <br><br><br><br><br>2<br><br><br><br>2<br><br>2 | 2<br><br>2<br><br><br><br>2<br><br><br>2<br><br>2<br><br>2<br>2 | Праверачная работа<br><br><br><br><br><br><br><br><br>Праверачная работа |
| **6.** | **ЛЕКСІКАЛОГІЯ** | **6** | **6** | **14** | Экзамен |
| | 1. Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Сувязь лексікалогіі з іншымі галінамі мовазнаўства.<br>2. Слова як асноўная адзінка мовы. Лексічнае і граматычнае значэнні слова.<br>3. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова. Віды пераносу значэнняў. Метафара, метанімія, сінекдаха, іх стылістычная, вобразна-выяўленчая і мастацкая роля ў мове. | 2 | <br><br><br>2 | <br><br>2 | <br><br>Вуснае апытанне<br>Тэст |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Амонімы. Крыніцы ўзнікнення амонімаў, іх паходжанне і развіццё. Размежаванне амонімаў і мнагазначных слоў. Амалексемы, амафоны, амаформы і амографы. Стылістычнае выкарыстанне амонімаў.<br>5. Паронімы. Граматычная характарыстыка паронімаў. Семантычныя асаблівасці і функцыі паронімаў. Стылістычныя памылкі ва ўжыванні паронімаў.<br>6. Сінонімы. Паняцце сінанімічнага рада і дамінанты. Семантычныя асаблівасці сінонімаў, іх узнікненне і развіццё. Граматычныя тыпы сінонімаў. Семантычныя і стылістычныя сінонімы. Семантыка-стылістычныя сінонімы. Кантэкстуальныя сінонімы. Абсалютныя сінонімы (дублеты).<br>7. Функцыянальнае ўжыванне сінонімаў, іх стылістычная роля і прызначэнне.<br>8. Антонімы. Лексіка-граматычныя і семантычныя асаблівасці антонімаў. Сродкі выражэння антаніміі. Агульныя і канцэптуальныя, поўныя і няпоўныя, агульнаўжывальныя і аўтарскія, індывідуальна-стылістычныя антонімы. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў.<br>9. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання. Спрадвечная лексіка беларускай мовы. Агульнаславянская лексіка. Усходнеславянская лексіка. Уласнабеларуская лексіка. Нацыянальная адметнасць беларускай лексікі. Запазычаныя лексіка ў беларускай мове, яе прыметы. Лексічныя запазычанні са славянскіх моў. Лексічныя запазычанні з неславянскіх моў. Інтэрнацыянальная лексіка. Экзатызмы і варварызмы. Калькі: поўныя і няпоўныя, словаўтваральныя і семантычныя.<br>10. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Дыялектная лексіка і яе разнавіднасці. Спецыяльная лексіка: тэрміны і прафесіяналізмы. Паняцце тэрміна і тэрміналогіі. Тэрміналагічная лексіка паводле паходжання: спрадвечна беларуская і запазычаная. Тэрміны вузкаспецыяльныя, агульнанавуковыя, міжнавуковыя.<br>11. Жаргонная лексіка. Аргатызмы.<br>12. Актыўная і пасіўная лексіка. Гістарызмы. Архаізмы. Неалагізмы. Шляхі ўзнікнення неалагізмаў і іх разнавіднасці.<br>13. Нацыянальная адметнасць беларускай лексікі. | 2<br>2 | 2<br>2 | 2<br>2<br>2<br>2<br>2<br>2 | Тэст<br>Праверачная работа |
| **7.** | **ФРАЗЕАЛОГІЯ** | **2** | **4** | **4** | Экзамен |
| | 1. Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Прадмет вывучэння і задачы фразеалогіі. Паняцце фразеалагічнай адзінкі. Класіфікацыя фразеалагізмаў: фразеалагічныя зрашчэнні (ідыёмы), фразеалагічныя адзінствы, фразеалагічныя злучэнні.<br>2. Класіфікацыя фразеалагізмаў паводле паходжання. Спрадвечныя беларускія і запазычаныя фразеалагізмы. | 2 | 2 | 2 | Тэст<br>Праверачная работа |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Фразеалагічныя калькі ў беларускай мове.<br>4. Стылістычная класіфікацыя фразеалагізмаў. Міжстылёвыя фразеалагізмы. Размоўна-гутарковыя і кніжныя фразеалагізмы.<br>5. Мнагазначнасць, сінанімічнасць, аманімічнасць і антанімічнасць фразеалагізмаў.<br>6. Прыказкі, прымаўкі, крылатыя выразы (афарызмы). Перыфразы. Перыфразы індывідуальна-аўтарскія і традыцыйныя.. | | 2 | 2 | Вуснае апытанне |
| **8.** | **ЛЕКСІКАГРАФІЯ** | **1** | **2** | **4** | Экзамен |
| | 1. Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства Прадмет і задачы лексікаграфіі.<br>2. Слоўнікі і іх тыпы. Энцыклапедычныя і лінгвістычныя слоўнікі. Агульныя энцыклапедычныя і галіновыя слоўнікі. Лінгвістычныя слоўнікі. Тыпы лінгвістычных слоўнікаў. Аднамоўныя і шматмоўныя (перакладныя) лінгвістычныя слоўнікі. Тыпы аднамоўных слоўнікаў: арфаграфічныя, тлумачальныя, дыялектныя, гістарычныя, этымалагічныя, тэрміналагічныя, фразеалагічныя, сінанімічныя, аманімічныя, паранімічныя, антанімічныя, анамастычныя, марфемныя, арфаэпічныя, частотныя і інш.<br>3. З гісторыі лексікаграфіі. Персаналіі беларускай лексікаграфіі. Лексікаграфічныя працы Ф. Скарыны, Л. Зізанія, П. Бярынды, І. Насовіча і інш. Лексікаграфічныя працы XX стагоддзя. | 1 | 2 | 2<br>2 | Тэст |
| **9.** | **МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ** | **1** | **2** | **4** | Экзамен |
| | 1. Паняцце марфемы. Марфемная структура слова. Слова і марфема. Тыпы марфем.<br>2. Аснова слова і канчатак. Канчатак, або флексія. Нулявы канчатак. Аснова слова і яе тыпы: невытворная і вытворная. Утваральная аснова. Суплетыўныя асновы.<br>3. Змены ў марфемнай будове слова: апрошчанне і перараскладанне.<br>4. Корань і афіксы. Корань слова. Свабодныя і звязаныя карані.<br>5. Афіксы і іх віды: прыстаўка, або прэфікс; суфікс; постфікс; інтэрфікс. Словаўтваральныя і формаўтваральныя афіксы. Сінанімічныя і антанімічныя афіксы.<br>6. Словаўтварэнне як раздзел мовазнаўства. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў: марфемны (суфіксальны, прыставачны, постфіксальны, прыставачна-суфіксальны, прыставачна-постфіксальны); субстантывацыя; лексіка-семантычны спосаб; складанне; складана-суфіксальны; зрашчэнні і абрэвіяцыя. | 1 | 2 | 2<br>2 | Праверачная работа |
| **10.** | **МАРФАЛОГІЯ** | **10** | **20** | **24** | Экзамен |
| | 1. Марфалогія як раздзел граматыкі, яе змест і задачы. Сувязь марфалогіі з іншымі раздзеламі мовазнаўства. Асноўныя паняцці марфалогіі: граматычнае значэнне, граматычная форма, граматычная катэгорыя. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Сістэма часцін мовы ў беларускай мове. | 2 | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Назоўнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: уласныя, агульныя, адушаўлёныя (асабовыя і неасабовыя), неадушаўлёныя, канкрэтныя, абстрактныя, зборныя, рэчыўныя. | | 2 | 2 | Тэст |
| | 2.1 Граматычныя катэгорыі назоўніка: род, лік, склон. Род назоўнікаў. Разыходжанні ў граматычным родзе некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Лік назоўнікаў. Разыходжанні ў ліку назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Склон назоўнікаў. Значэнні склонаў. | | | | |
| | 2.2 Тыпы скланення назоўнікаў. Першае скланенне назоўнікаў. Другое скланенне назоўнікаў. Трэцяе скланенне назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Рознаскланяльныя і нескланяльныя назоўнікі. Словаўтварэнне назоўнікаў. | 2 | 2 | 2 | |
| | 3. Прыметнік як часціна мовы. Лексіка-граматычныя разрады прыметніка: якасныя, адносныя і прыналежныя. Якасныя прыметнікі. Адносныя прыметнікі. Прыналежныя прыметнікі. Поўныя і кароткія формы прыметнікаў. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Формы суб’ектыўнай ацэнкі якасных прыметнікаў. Скланенне прыметнікаў. Словаўтварэнне прыметнікаў. | | 2 | 2 | |
| | 4. Лічэбнік як часціна мовы. Разрады лічэбнікаў. Колькасныя лічэбнікі. Іх скланенне і спалучальнасць з назоўнікамі. Зборныя лічэбнікі. Дробавыя лічэбнікі. Парадкавыя лічэбнікі. Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі. | 2 | 2 | 2 | Кантрольная работа |
